# ПРАФЕСІЯ ЦІ МІСІЯ?

**Мікалай БАШКО:**

— Змены павінны адбыцца ў свядомасці саміх настаўнікаў, паколькі многія з іх, на жаль, лічаць, што займаюцца непрэстыжнай і малааплатнай працай. Між іншым, настаўнік ніколі вялікіх грошай не зарабляў, але статус абавязваў да самапавагі і годнасці. А ці мае годнасць настаўнік, якога паставілі адкрываць дзверы перад членамі высокапастаўленай дэлегацыі? Сумняваюся... Школа павінна займацца тым, чым яна павінна займацца: вучыць і выхоўваць. Я нічога не маю супраць конкурсу юных інспектараў дарожнага руху, але сёння гэтае мерапрыемства становіцца ці не галоўным у школе. І такіх прыкладаў можна прывесці дзясяткі. Ва ўстанове адукацыі і ў рэгіёне павінен быць моцны кіраўнік, які не пабаіцца сказаць «не» шматлікім інстанцыям, якія спрабуюць перакласці на школу сваю работу. Сёння любы кіраўнік спрабуе паказаць сваю ўладу над настаўнікам.

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Калі настаўнік перастане, нарэшце, выконваць чужыя абавязкі, у першую чаргу — бацькоў, расправіць крылы і будзе адчуваць сябе больш упэўнена, стаўленне да яго адразу зменіцца. Непавага да настаўніка — гэта элемент маралі сучаснага грамадства і яго сістэмы каштоўнасцяў. Праблема ў тым, што ў вачах абывацеляў настаўнікі — гэта вінцікі ў вялікай машыне, якія не маюць уласнага меркавання. Пастаянныя праверкі, непатрэбная паперавытворчасць, неабходнасць выпрошваць у бацькоў грошы на рамонт школы, запаўненне справаздач... Кантроль патрэбны не для кантролю, а для дапамогі і паляпшэння вынікаў!

**«Наша прафесія супрацьпаказана людзям, арыентаваным на атрыманне хуткага выніку. Педагогіцы ўласцівае такое паняцце, як «адтэрмінаваны вынік».**

Чаму, скажам, у Фінляндыі прэстыжна працаваць настаўнікам? Таму што там ёсць разуменне: грамадства давярае педагогу самае каштоўнае — сваю будучыню, а праца настаўніка — гэта ўкладанні ў чалавечы капітал. Адна мая сяброўка і калега, калі гаворка заходзіць пра нізкі сацыяльны статус педагога, адказвае: «Не, не чула!» І можа дадаць сабе пад нос, каб не шакіраваць суразмоўцу: «А ваш сын адпачываў на Балі?» Не, яна не з мільянераў. Настаўніцкая сям'я: абодва выкладаюць у гарадской школе і атрымліваюць звычайны настаўніцкі заробак. Проста мае сябры даўно зразумелі, што яны — трымальнікі больш каштоўных акцый, чым грошы. Менавіта яны могуць зрабіць унёсак у той самы чалавечы капітал, а для гэтага трэба не стаяць на месцы, пастаянна развівацца, быць цікавымі і сучаснымі. Старэйшы сын, маючы такіх бацькоў, набраўся розуму, выйграў шмат конкурсаў і з даследнымі вучнёўскімі працамі аб'ехаў паўсвету. У тым ліку пабываў і на Балі...

Атрымліваецца, што чалавечы капітал прыносіць і матэрыяльныя дывідэнды. Добрае імя настаўніка трэба аднаўляць тэрмінова. Спачатку трэба дбаць пра ўласны статус, а потым прыйдзе час і супольнага. Толькі матэрыяльным заахвочваннем справа не вырашыцца. Шмат залежыць ад нас саміх: ад умення пастаяць за сябе, ад нашай згуртаванасці, жадання вярнуць у школу маральныя каштоўнасці, прафесійную этыку.

## ПРАЦУЕМ НА КОЛЬКАСЦЬ, А НЕ НА ЯКАСЦЬ

**Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:**

— З прафесійнай этыкай у нас і сапраўды праблемы. Я працую ў сельскай школе, дзе вучацца ў тым ліку і дзеці педагогаў. І вось раптам педагог перастае быць педагогам і становіцца проста мамай: пачынае выказваць незадаволенасць адзнакамі свайго дзіцяці, крытыкаваць іншага педагога. Як увогуле можна абмяркоўваць з дзецьмі іншых настаўнікаў? Яшчэ горш, калі бацькі пачынаюць крычаць на настаўніка або дырэктара школы. «Калі настаўнікі дазваляюць крычаць адзін на аднаго, дык чаму я не магу пакрычаць на настаўніка?» — прыкладна так, напэўна, разважаюць людзі. У сельскай школе ўсе і ўсё навідавоку, таму настаўнікам трэба моцна задумацца над мадэллю сваіх паводзінаў.

Што тычыцца праверак школы... Іх сапраўды шмат, а вось праверак якасці адукацыі — няшмат, а школе трэба вяртацца менавіта да якасці адукацыі. Мы сталі цэнтрам, на які ўсе перакладаюць свае задачы. Я працую намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце. Планую сваю працу на паўгода—год, а потым за дзень ці тыдзень па электроннай пошце прыходзяць 10 лістоў з указаннямі, якія ты павінен абавязкова выканаць. І вось усе твае планы разбураны. Атрымліваецца, што мы працуем на колькасць, а не на якасць. Я лічу, што нельга ў кожнай школе рэалізоўваць па 100 працэнтаў усе напрамкі дзейнасці. У мяне 250 дзяцей, а ў суседняй школе, скажам, 1000 дзяцей. І мы, таксама як і нашы суседзі, павінны закрываць усе мерапрыемствы, што нам спускаюць? У школе ёсць 60 вучняў-актывістаў, з іх 30 удзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах...

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Вельмі шмат намаганняў па ўдасканаленні школы былі накіраваны на рамонт і напаўненне прыгожымі стэндамі кабінетаў, падрыхтоўку новых падручнікаў і метадычных дапаможнікаў, закупку дарагога абсталявання, але не на саміх настаўнікаў. Гэта ўсё, безумоўна, важна, але на якасць адукацыі наўрад ці паўплывае. Можна напісаць выдатную справаздачу, памяняць вокны на шклопакеты, шторы на жалюзі, але за гэтым нічога не стаіць. Галоўнае для школы ўсё ж такі паляпшэнне самой якасці выкладання. А гэта магчыма толькі праз пастаянную самаадукацыю педагогаў, павышэнне ўласнай прафесійнай самаацэнкі. Аўтарытэтам у вучняў і іх бацькоў будзе карыстацца настаўнік, які дасканала валодае сваім прадметам, эрудзіраваны, мае шырокі кругагляд і веды ў сумежных галінах.

## НЕ ХУТКІ ВЫНІК

***— Абітурыентам па 17-18 гадоў. Як зразумець, хто з іх зможа стаць сапраўдным настаўнікам, а каму гэтая прафесія проціпаказаная? І ўвогуле, ці можна стаць настаўнікам, проста набыўшы педагагічную спецыяльнасць?***

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Добрым настаўнікам можна быць, нават не скончыўшы педагагічную ВНУ. Прыгадайце пасляваенныя часы, калі школьныя прадметы выкладалі франтавікі, і іх вучні з удзячнасцю захоўваюць памяць пра сваіх педагогаў. Мяркую, што гэтая прафесія супрацьпаказана людзям, арыентаваным на атрыманне хуткага выніку. Такія людзі часцей расчароўваюцца, калі ў іх вучняў штосьці не атрымліваецца, калі педагагічныя намаганні, па іх меркаванні, не апраўдваюць сябе. Педагогіцы ўласціва такое паняцце, як «адтэрмінаваны вынік». Старажытнарымскі філосаф Сенека калісьці сказаў: «Каго багі жадаюць пакараць, таго яны робяць педагогам». Ён выдатна ведаў кошт настаўніцкага хлеба, бо быў настаўнікам Нерона. Настаўнік — гэта стан душы, гэта лад жыцця і думак, гэта філасофія і светапогляд.

**Мікалай ЗАПРУДСКІ:**

— У некаторых краінах перад прыняццем ва ўніверсітэт усе будучыя педагогі праходзяць спецыяльнае інтэрв'ю, падчас якога выкладчыкі спрабуюць высветліць, як чалавек будзе весці сябе ў той ці іншай сітуацыі, як ён будзе рэагаваць на магчымую крытыку з боку навучэнцаў ці іх бацькоў, як будзе паводзіць сябе з так званымі «цяжкімі» вучнямі. Там звяртаюць увагу не толькі на акадэмічную паспяховасць прэтэндэнтаў, але і на іх маральна-псіхалагічныя якасці, без якіх педагог не можа адбыцца. Але ж у нашых умовах, улічваючы невысокую цікавасць моладзі да педагагічных прафесій, ёсць пагроза, што пры ўвядзенні дадатковага прафадбору колькасць абітурыентаў можа зменшыцца.

Я нядаўна гутарыў з дырэктарам Альхоўскай школы Астравецкага раёна Сяргеем Анатольевічам Гаўрыловічам. У сярэдніх класах вучні яго школы ў гэтым годзе мелі магчымасць паспрабаваць сябе ў 9 прафесіях, запатрабаваных на рынку працы, у тым ліку, безумоўна, настаўніцкай. Магчымасць прафесійных спроб яшчэ падчас навучання ў школе — вельмі эфектыўны механізм, які дазваляе зменшыць колькасць памылак пры выбары будучага профілю навучання і будучай прафесіі. Пажадана, каб адукацыйныя і прафесійныя самавызначэнне дзяцей адбывалася да заканчэння базавай школы. Таму няхай бы ў школах як мага часцей вучні сярэдніх класаў спрабавалі праводзіць урокі, пазакласныя мерапрыемствы са сваімі аднакласнікамі, з малодшымі вучнямі. Няхай бы ўцягваліся ў розныя педагагічныя праекты. Такім чынам і самі вучні, і настаўнікі будуць бачыць, у каго ёсць цікавасць і, галоўнае, здольнасці да педагагічнай работы.

## ПЕДАГОГІ ПАКАЛЕННЯ «NEXT»

***— Маладыя настаўнікі прызнаюцца, што ў школе ёсць шмат чаго, чаму студэнтаў не вучаць ва ўніверсітэтах. Напрыклад, як наладжваць стасункі не толькі з дзецьмі, але і з іх бацькамі. Яны скардзяцца на адсутнасць у першы год работы падтрымкі з боку старэйшых калег. Маладыя педагогі баяцца паказацца ў калектыве «белай варонай», выскачкай, якой трэба найбольш за ўсіх. Акрамя таго, абвяшчэнне сваёй уласнай пазіцыі можа мець для смельчака непрыемныя наступствы...***

**Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:**

— Напэўна, нельга ва ўніверсітэце падрыхтаваць да ўсяго — настаўнік проста павінен быць гатовы да пастаяннага самаразвіцця і ўдасканалення. Калі я навучаўся, нам давалі шмат тэарэтычных ведаў, вось толькі магчымасцяў прымяніць іх было няшмат: на педагагічную практыку адводзілася зусім няшмат часу. У мяне ёсць прапанова, як адпрацаваць псіхалагічныя аспекты работы будучага настаўніка. Таму што калі мы прыходзім на ўрок, то ў першую чаргу павінны ўстанавіць з дзецьмі сувязь, і толькі калі яна будзе наладжана, можна перадаваць вучням свае веды. Я вучыўся ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце, і за пяць гадоў навучання на педагагічнай практыцы ў аздараўленчым летніку мы былі ўсяго адзін раз... Асабіста ў мяне няма праблем у стасунках ні з дзецьмі, ні з іх бацькамі. Але я быў з дзецьмі ў летніку сем разоў, бо я хацеў там быць, і для мяне ён аказаўся тым месцам, дзе я навучыўся працаваць у дзіцячым калектыве, а дзеці ў атрадзе самыя розныя, як і ў класе... Калі ты працуеш у летніку, то будзеш выступаць у самых розных амплуа (арганізатарам, рэжысёрам, мастаком-афармліцелем, псіхолагам, спартсменам, бардам, паэтам, акцёрам), але гэта ідзе будучаму педагогу толькі на карысць.

**Аляксандр АНДАРАЛА:**

— Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ідзе ў нагу з часам. Мы разумеем, што практыкаарыентаванае навучання павінна быць большай, таму ў гэтым годзе (пакуль у якасці эксперыменту) прынялі рашэнне пачаць укараняць педагагічную практыку ўжо з другога курса: студэнты трох нашых факультэтаў (матэматычнага, фізічнага і прыродазнаўчага) адзін дзень у тыдзень праводзяць у школе. А з наступнага навучальнага года збіраемся ўводзіць валанцёрскую практыку ўжо на першым курсе, а потым у студэнтаў будзе ўжо педагагічная практыка. Такім чынам, усе гады свайго навучання нашы студэнты будуць займацца практычнай педагагічнай работай. Мы разумеем, што шмат залежыць ад кіраўніка практыкі, ад таго, наколькі фармальна ці нефармальна ён ставіцца да сваёй работы. Педпрактыка не павінна быць імітацыяй, таму вельмі ўважліва выбіраем базу для праходжання практыкі нашымі студэнтамі.

**«Паспяховы настаўнік у школе мае большы ўплыў на сваіх вучняў і іх бацькоў, чым любыя сродкі масавай інфармацыі».**

Што тычыцца працы ў летніках, то за нашымі студэнтамі выстройваецца чэргі. Асабліва іх чакаюць, калі адкрываецца першая аздараўленчая змена, а школьныя педагогі яшчэ не вызваліліся ад сваіх абавязкаў на асноўнай рабоце. Мы ідзём насустрач і дазваляем студэнтам здаць сесію датэрмінова. Цудоўна разумеем, што сучасны настаўнік не можа быць проста «ўрокадацелем». Ён яшчэ і выхавальнік. А калі педагог будзе яшчэ і цікавым чалавекам, нешта прапаноўваць, арганізоўваць, то дзеці будуць за ім бегаць. Педагагічная практыка ў летніках і сапраўды вельмі карысная.

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— А я хацела б звярнуць увагу ўсіх на наступную праблему: школа не заўсёды гатова прыняць маладога педагога пакалення «next». Для старэйшых калег па прафесіі і для адміністрацыі школы малады настаўнік — часта такі ж дзіўны і незразумелы чалавек, як, скажам, сучасны старшакласнік. Ды і па ўзросце ён ад адзінаццацікласніка не моцна адрозніваецца. Натуральна, малады спецыяліст здзяйсняе шмат прафесійных памылак, ён менш дасведчаны, чым яго калегі, якія працуюць у школе ўжо не першы год. Да таго ж не заўсёды хапае ведаў па прадмеце, па методыцы выкладання, асаблівасцях узроставай псіхалогіі, навыках узаемадзеяння з вучнямі. Аднак замест слоў падтрымкі часта ў яго адрас гучаць абразлівыя пытанні: «І чаму вас толькі ва ўніверсітэце вучылі?» ці «Вы нават ГЭТАГА не ведаеце?» і г.д. А маладому настаўніку — прадстаўніку новага пакалення — неабходны поспех, кар'ера, прызнанне. Такім чынам узнікае супярэчнасць паміж жаданнем самарэалізавацца і абмежаваннем магчымасцямі для яго ажыццяўлення. А ці варта ўвогуле навязваць маладому чалавеку сістэму выхавання, якая была актуальнай у XIX — XX стагоддзях, калі мы імкнёмся да стварэння канкурэнтаздольнай сістэмы адукацыі? Бо вельмі лёгка засвоіць догмы і вельмі складана потым пазбавіцца ад педагагічных стэрэатыпаў у выкладанні. Старая біблейская мудрасць сцвярджае: новае віно ў старыя мяхі не заліваюць. Між іншым, і вопытным настаўнікам ёсць чаму павучыцца ў моладзі, хоць бы ўжыванню розных гаджэтаў, а вучыць маладых настаўнікаў, як рабіць прэзентацыі, увогуле смешна.

## НЕ КРЫНІЦА, А ФІЛЬТР

***— Ад настаўніка вельмі многага чакаюць. Больш за тое, сям'я сёння спрабуе перакласці на педагога і свае абавязкі. Як вы мяркуеце, ці змянілася кардынальным чынам місія педагога? І якімі якасцямі павінен валодаць сучасны настаўнік?***

**Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:**

— Калі раней мы былі кранам — адзінай крыніцай вады, то зараз мы фільтр, а кран пераўтвараўся ў брандспойт. Задача настаўніка — навучыць фільтраваць гэту інфармацыю, знаходзіць у моры непатрэбнай — карысную. Ніхто не жадае ставіць на свой кран брудны фільтр, таму мы першапачаткова павінны быць для сваіх вучняў аб'ектам для пераймання. Раней вучань ішоў да настаўніка, у бібліятэку, а сёння ён адкрывае Google.

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Галоўнае, каб сам настаўнік быў гатовы да перамен, да таго, што ён на працягу сваёй прафесійнай дзейнасці павінен развівацца і змяняцца ў залежнасці ад абставін, ад патрэб дзіцячай аўдыторыі. Гэта новае пакаленне, і з гэтым трэба лічыцца.

**Мікалай ЗАПРУДСКІ:**

— Мы прапанавалі прасунутым педагогам на курсах павышэння кваліфікацыі назваць рысы, якія вылучаюць эфектыўных настаўнікаў. На першае месца яны паставілі стварэнне ўмоў для развіцця індывідуальных здольнасцяў навучэнцаў. Потым — глыбокае валоданне прадметнымі ведамі і ўменнямі, а на трэцяе — паспяховае паступленне выпускнікоў у ВНУ без рэпетытараў і падрыхтоўку пераможцаў алімпіяд. А на апошніх месцах у рэйтынгу аказалася ўменне супрацоўнічаць, арганізаваць клас і ўменне ствараць сітуацыі поспеху для кожнага. Такое ранжыраванне, пэўна, абумоўлена існуючымі ўстаноўкамі з боку кіраўніцтва: пераможцы алімпіяд і конкурсаў — любой цаной! Але ж не гэта ў школе павінна быць галоўным!

## ЗДЗЕЙСНЕНАЯ МАРА — ЛЁС

***— Уявіце сабе дзяўчынку, якая з дзяцінства марыла стаць настаўніцай. Але яна вырасла і стаіць перад выбарам: якую прэстыжную прафесію і якую ВНУ ёй абраць? Дапамажыце знайсці словы, што дапамогуць пераканаць яе зрабіць выбар менавіта на карысць прафесіі настаўніка...***

**Мікалай ЗАПРУДСКІ:**

— Па-першае, чаму менавіта дзяўчынку, можа, лепш хлопца, бо ў школе асабліва не хапае мужчын? Па-другое, важна, хто будзе гэта гаварыць: калі старшакласнікі чуюць агітацыю ад настаўнікаў, якія паспяхова рэалізавалі сябе ў прафесіі, шмат чаго дасягнулі, то плён будзе. Няхай бы ўсе паспяховыя і харызматычныя настаўнікі мелі сваім абавязкам выхаваць некалькі сваіх паслядоўнікаў. Настаўнікі-метадысты, а вы прафарыентацыйную работу праводзіце?

**Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:**

— Я лічу, што, стаўшы настаўнікам, ты назаўсёды застанешся маладым. Гляджу ў вочы сваёй бабулі, якая ўжо шмат гадоў не працуе ў школе, а яны ў яе ўсё такія ж маладыя. У настаўнікаў, якія на пенсіі, па-ранейшаму крыштальны розум і позірк. Хочаш быць заўсёды маладым, быць сярод дзяцей — гэта твой шлях. Гэта ж так цудоўна — ствараць свет дзіцяці і напаўняць яго фарбамі!

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Дзякуючы табе, вучні змогуць здзейсніць у будучыні вялікія адкрыцці, дапамогуць чалавецтву пазбавіцца ад хвароб, стаць добрымі людзьмі і змяніць свет да лепшага.

**Іван ЯКІМЕНКА:**

— Калі ёсць мара, значыць, яе трэба здзейсніць, таму што здзейсненая мара — гэта лёс. Толькі адданасць любімай прафесіі дапаможа стаць шчаслівым чалавекам.

**Аляксандр АНДАРАЛА:**

— А я хачу дадаць, што педагагічную адукацыю мелі і маршал Савецкага Саюза Іван Якубоўскі, і Пётр Міронавіч Машэраў. Нікому яшчэ веды ў педагогіцы і псіхалогіі лішнімі ў жыцці не былі. Я ведаю, што некаторыя іншагароднія абітурыенты сумняваюцца — ехаць ці не ехаць ім у сталіцу, бо баяцца праблем з жыллём. Хачу іх заспакоіць: усіх іншагародніх першакурснікаў мы забяспечым месцамі ў інтэрнаце! Так што не сумнявайцеся...

**«Круглы стол» правяла Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by